УДК 94(476):336.275.3

# СПАДЧЫНА РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ФІНАНСАВЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАХ САМАДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIX СТ.)

*Ерашэвіч А. У.*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь

***Анатацыя.*** *У артыкуле асветлены некаторыя аспекты, звязаныя з прынятымі манархічнай уладай фінансавымі абавязацельствамі пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай. Разгледжаны пытанні ўрэгулявання выплаты даўгоў былой польскай рэспублікі, апошняга караля дзяржавы Станіслава Аўгуста Панятоўскага і яго прыбліжаных, некаторых арыстакратаў (Салагубаў). Раскрыты некаторыя абставіны па выкупу дзяржавай былых у Рэчы Паспалітай прыватнаўласніцкіх мястэчак і прыватнаўладальніцкіх гарадоў з мэтай атрымання імі статусу афіцыйных павятовых ці заштатных гарадоў.*

***Ключавыя словы:*** *фінансавыя абавязацельствы; грашовыя даўгі; пакупка мястэчак; Рэч Паспалітая; Станіслаў Аўгуст Панятоўскі; Салагубы; беларускія землі; Расійская імперыя.*

# THE LEGACY OF THE POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH IN THE FINANCIAL OBLIGATIONS OF THE AUTOCRATIC POWER OF THE RUSSIAN EMPIRE ON THE TERRITORY OF BELARUS (LATE XVIII-FIRST HALF OF THE XIX CENTURY)

*Yerashevich A. V.*
Belarusian State Economic University
Minsk, Belarus

***Annotation.*** *The article highlights some aspects related to the financial obligations assumed by the monarchical authorities after the incorporation of the Belarusian lands into the Russian Empire as a result of the partitions of the Polish-Lithuanian Commonwealth. The issues of settling the payment of debts of the former Polish republic, the last king of the state Stanislaw August Poniatowski and his entourage, some aristocrats, are considered Some circumstances related to the states purchase of the former privately owned towns and cities in the Polish-Lithuanian Commonwealth in order to obtain the status of official county or provincial towns are revealed.*

***Keywords***: *financial obligations; monetary debts; purchase of small towns; Polish-Lithuanian Commonwealth; Stanislaw August Poniatowski; Salaguby; Belarusian lands; Russian Empire.*

*Урэгуляванне даўгоў Рэчы Паспалітай, караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.* Знікненне Рэчы Паспалітай у выніку падзелаў і далучэнне яе ўсходніх правінцый да Расійскай імперыі былі звязаны з пераходам фінансавых абавязацельстваў ліквідаванай дзяржавы ў спадчыну да манархічных улад яе суседзяў.

Да канца 1767 г. г. каралеўскія даўгі дасягалі сумы ў 3,5 млн злотых. Сейм 1776 г. упаўнаважыў Станіслава Аўгуста Панятоўскага ўзяць у галандскіх банкіраў 9 млн злотых пазыкі з выплатай яе на працягу 10 гадоў. Аднак у 1786 і 1791 гг. з'явіліся новыя галандскія пазыкі. У пачатку 1792 г. даўгі апошняга польскага караля павялічыліся да 21 млн злотых, у 1793 г. у час Таргавіцкай канфедэрацыі – да 33,5 млн злотых, а ў час яго смерці 12.02.1798 складалі 40 млн злотых [1, с. 214–215]. Усе даўгі апошняга караля Рэчы Паспалітай і іншых польскіх асоб склалі суму больш за 15,9 млн гульдэнаў (пазыка на пагашэнне даўгоў караля ў 1,5 млн руб.) [2, с. 31, 34]. Утрыманне былога польскага караля з яго шматлікай світай каштавала штомесячна 11 тыс. чырвонцаў, ці 33 тыс. руб. серабром, альбо 396 тыс. руб. серабром штогод [3, с. 22–24].

Паводле ўмоў паднісанай у Пецярбургу 13(24).10.1795 г. трохбаковай канвенцыі аб канчатковым падзеле Рэчы Паспалітай паміж Расіяй і Прусіяй была заключана генеральная дамова аб падзеле даўгоў польскага караля па палажэннях Гродзенскага сейма 1793 г.: 60 % сумы былых даўгоў польскай рэспублікі дзяліліся паміж гэтымі дзяржавамі папалам, а польскай рэспубліцы былі пакінуты да выплаты астатнія 40 %. Размешчанаму ў Гродне польскаму каралю было вызначана 330 тыс. чырвонцаў штогадовага ўтрымання, з якіх палова сумы прызначалася для ўласнага яго забеспячэння, а другая частка пакідалася (заставалася) у агульным распараджэнні дзяржаў для выплаты ўласных даўгоў Станіслава Аўгуста Панятоўскага памерам да 600 тыс. руб. [4, с. 359, 360].

Згодна з артыкулам 3 Канвенцыі ад 4(15).01.1797 г. аб канчатковым падзеле Польшчы і адрачэнні назаўсёды польскага караля ад прастола на карысць імператрыцы Кацярыны II, прызнаныя Гродзенскім сеймам 1793 г. галандскія даўгі з працэнтамі размяркоўваліся паміж дзяржавамі-ўдзельніцамі ліквідацыі польскай дзяржавы наступным чынам: выплату 3/10 іх часткі брала на сябе Расійская імперыя, столькі ж Прусія, а астатняя 4/10 доля падзялялася паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй на роўныя часткі. Каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму прызначалася да вы-

платы 200 тыс. чырвонцаў штогадовай пенсіі з часу пераезду яго ў Гродна [5, с. 281–282].

15(26).01.1797 г. прадстаўнікі расійскага, прускага і аўстрыйскага двароў падпісалі канвенцыю аб урэгуляванні фінансавых пытанняў зніклай з палітычнай карты Еўропы Рэчы Паспалітай. Фнансавыя абавязацельствы дзяржаў, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі Рэчы Паспалітай, па прапорцыях выплат польскіх даўгоў залежалі ад памераў атрыманых імі па падзелах яе тэрыторый, далучаных да гэтых дзяржаў. Расійская імперыя і Прусія павінны былі пагасідь па 43 % агульнай сумы даўгоў польскай рэспублікі і па 40 % даўгоў караля, Аўстрыя – адпаведна 14 і 20 %. Праз некалькі месяцаў пасля падпісання канвенцыі расійскі ўрад у аднабаковым парадку абавязваўся пакрыць яшчэ і запазычанасці арыстакратаў. У 1798 г. Расійская імперыя прыняла на сябе абавязак выплаты і прыватных даўгоў шляхты на далучаных да яе землях.



*Малюнак 1.* **Марчэла Бачарэлі. Смерць Станіслава Аўгуста Панятоўскага. 1798 г. (Адкрытая крыніца, грамадскі набытак)**

Да 1798 г. усе замежныя пазыкі і даўгі Рэчы Паспалітай, прынятыя імператарскай Расіяй на сябе, былі зацверджаны ў адну агульную аблігацыю, выданую банкірам Гопе і К⁰ на суму ў 88 300 000 галандскіх гульдэнаў ці 50 331 000 руб. серабром з пагашэннем на працягу 12 гадоў да 1809 г. [6]. У выніку канверсіі ў 1798 г. галандскай пазыкі імператарскай Расіі доўг Рэчы Паспалітай, караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага і магнатаў быў уключаны ў агульную суму запазычанасці дзяржаўнай казны перад амстэрдамскімі банкірамі «Гопе і К⁰» (амстэрдамскі банк, які быў заснаваны купцом шатландскага паходжання Томам Хоўпам (Thom Hope) (1704–1779) у 1762 г., быў адным з найбольшых у Галандыі, меў філіялы ў Лондане і іншых гарадах), у якім «польскі» грашовы доўг склаў амаль 16 млн гульдэнаў (18,1 %) з 88,3 млн гульдэнаў агульнай сумы пазыкі імперыі Раманавых.

Кіраўніцтва імператарскай Расіі выплачвала не толькі «галандскія» пазыкі ўрада, караля і магнатаў, але і даўгавыя сумы некаторых асоб з шляхты збанкрутаваўшымся польскім банкірам і прыватным асобам розных дзяржаў, замежным банкам. Беручы на сябе абавязацельствы па выплаце грашовых даўгоў караля, некаторых магнатаў, шляхты скасаванай рэспублікі, расійскі ўрад кіраваўся не дабрачыннымі меркаваннямі, а пераследаваў палітыка-ідэалагічныя мэты – займець лаяльнасць да новай улады і сацыяльную апору з боку паланізаваных магнатаў і шляхты земляў былой Рэчы Паспалітай расійскага панавання. Доказ надзейнасці прынятых урадам Расійскай імперыі даўгавых абавязацельстваў былой польскай рэспублікі служыў пераканаўчым пацвярджэннем замацавання патэрналісцкіх адносін, дэманстраваў папячыцельскі клопат у адносінах да магнатаў і шляхты, якія паступова інкарпараваліся ў склад расійскага дваранства пры ўмове вернападданай прысягі пры захаванні маёмасных правоў.

Падтрымка «польскага дваранства» выяўлялася ў тым, што ў выніку імператарская Расія заплаціла адпаведна канвенцыі не 43,3 % агульнай сумы доўгу польскай рэспублікі, а 52,1 % [7].

Паводле артыкула 43 Венскага трактата ад 12.04.(8.05.)1815 г. аб утварэнні Царства (Каралеўства) Польскага для задавальнення саступленых Прусіяй тэрыторый з імператарскай казны кампенсавалася 4 609 580 злотых, уключаючы і рэштку старых даўгоў польскага караля і рэспублікі [8].

Такім чынам, пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ліквідацыі польскай дзяржаўнасці Расійская імперыя прыняла ўдзел у выплаце грашовых

даўгоў былой рэспублікі, апошняга караля дзяржавы Станіслава Аўгуста Панятоўскага, некаторых арыстакратаў і шляхты.



*Малюнак 2.* **Марчэла Бачарэлі. Панятоўскі, партрэт у профілі. 1780 г. (Адкрытая крыніца, грамадскі набытак)**

*Удзел дзяржавы ва ўпарадкаванні даўгоў Салагубаў.* Пры пасрэдніцтве расійскай дзяржавы рэгулявалася справа ўпарадкавання і выплаты казённых і прыватных спадчынных даўгоў буйных землеўласнікаў (Радзівілаў, Агінскіх і інш.). Цікавай выглядае справа ўрэгулявання даўгоў роду Салагубаў. Польскі граф, маёр артылерыі, генерал-ад'ютант Станіслава Аўгуста Панятоўскага (з 1774 г.) Ян (Іван) Сала-

губ пасля пераходу ў Расію пастуніў там на вайсковую службу ў чыне палкоўніка, з 1777 г. стаў камандзірам Славенскага гусарскага палка, з 1779 г. Беларускага гусарскага палка, а ў 1785 г. набыў званне генерал-маёра, удзельнічаў у руска-турэцкай вайне 1787–1791 гг. Удалая кар'ера графа стала магчымай і дзякуючы яго ўступленню ў шлюб з дачкой Л. А. Нарышкіна. Пасля разводу са сваёй першай жонкай княгіняй Марыяй Сапегай 24.11.1780 г. імператрыца Кацярына II уласнаручна абручыла пярсцёнкамі палкоўніка з сваёй фрэйлінай Наталляй Львоўнай Нарышкінай. Вянчанне адбылося 28.08.1781 г. Заўважым, што Марыя Антонаўна Нарышкіна была фаварыткай імператара Аляксандра I.

Салагубы валодалі буйным Горы-Горацкім маёнткам у Аршанскім павеце. У 1812 г. граф Л. Салагуб разам з апекуном Няплюевым заключыў з генерал-інтэндантам 1-й Заходняй арміі Я. Ф. Канкрыным кантракт на пастаўку для арміі сухароў. Гарантыяй за дадзены яму аванс у памеры 173 416 руб. былі закладзеныя 20 прыгонных музыкантаў маёнтка. Паводле ўказа ад 03.08.1821 г. палкоўнік граф Л. Салагуб узяў на восем гадоў 1 906 000 руб. асігнацыямі крэдытнай пазыкі пад заклад 9533 душ сялян Горы-Горацкага маёнтка ў Магілёўскай губерні [9]. Граф не выканаў умовы кантракту, а пасля закладу яго маёнтка ў Пазыковым банку сума ўсіх прыватных і дзяржаўных даўгоў памешчыка павялічылася да 4,5 млн руб. [10, с. 44]. Да 1827 г. яго казённыя даўгі, акрамя прыватных, дасягалі сумы да 1 848 820 руб. асігнацыямі. Памешчык запазычыў Пазыковаму банку 2 701 066,7 руб. асігнацыямі, уключаючы прэтэнзію прынца А. Віртэмбергскага па недахопу грошай пры здачы Езерыцкага староства 58 966,97 руб. асігнацыямі капітальнай сумы, якая на падставе ўказа ад 28.05.1826 г. была прылічана 02.06.1826 г. да банкаўскага доўгу, каля 250 тыс. руб. правіянцкаму ўпраўленню 1-й арміі, 60 тыс. руб. манастырам, разам 3 011 066,7 руб. [11, с. 94]. Узамен саступленага права на казённыя маёнткі (Езерыйскае староства з плацяжом 14 142,85 руб. сер. да 01.07.1848 г., староствам Шарашоўскага і Патумшэўскага за 10681,21 руб. да 12.04.1842 г., разам 24 824,06 руб. сер.) А. Вюртэмбергскі атрымаў грашовыя выдачы з дзяржаўнага казначэйства [12, с. 191–192]. Частка Горы-Горацкага маёнтка была прызначана ў публічны продаж для выплаты даўгоў, а частка апынулася ў дзяржаўнай апецы з пераводам на казну часткі грашовых запазычанасцей. Так, доўг дзяржаўнага казначэйства ад 01.02.1827 г. па даўгах графа Л. Салагуба Мінскаму манастыру рахітаў склаў 1093,44 руб. з штогодным плацяжом 6 % [13, с. 282].

З сакавіка 1827 г. Горы-Горацкі маёнтак графа Л. Салагуба (9671 рэвізская душа мужчынскага полу) быў прыняты ў казённы нагляд. З 1827 да 1829 г. у Пазыковы банк паступіла толькі 99 885 руб., у той час як адны працэнты па казённых даўгах графа складалі суму да выплаты ў памеры 196 515,61 руб. штогод. Сям'і Л. Салагуба па палажэнні Камітэта міністраў ад 01.02.1827 г. прызначалася па 14 тыс. руб. штогод грашовага ўтрымання з даходаў маёнтка да яго продажу. (Камісія вызначыла 16.05.1825 г. на ўтрыманне сям'і выдаваць 12 тыс. руб. і на выхаванне дзяцей 2400 руб.). Даўгі Пазыковаму банку па 13.03.1829 г. у памеры 2 969 327,77 руб. было загадана перавесці на дзяржаўнае казначэйства з выплатай банку па 24-гадавых правілах давання пазык. Доўг правіянцкаму ведамству па 13.03.1829 г. у 240 697,92 руб. прадпісвалася не лічыць па ведамству. Царкоўныя даўгі Горы-Горацкай царкве (2497,46 руб.) і Мінскаму рахіцкаму манастыру (3826,09 руб.) таксама былі пераведзены на кошт дзяржаўнага казначэйства, прычым працэнты па іх пагашаліся за кошт дзяржаўнага казначэйства на рахунак даходаў з маёнтку. Грашовае ўтрыманне ў 14 тыс. руб. сям'і Л. Салагуба было спынена. Імператар таксама распарадзіўся, каб залішнія 3275,88 руб. з 02.07.1829 г. больш не спаганяліся [14, арк. 2, 3, 16 адв.–19, 110, 113].

*Перавод былых прыватнаўласніцкіх мястэчак і прыватнаўладальніцкіх гарадоў у афіцыйныя павятовыя цэнтры ці пазаштатныя гарады.* Былыя ў Рэчы Паспалітай прыватнаўласніцкія мястэчкі і прыватнаўладальніцкія гарады паступова выкупляліся дзяржавай для атрымання імі статусу афіцыйнага павятовага ці заштатнага горада. Ва ўзнагароду за мястэчка Сураж, якое знаходзілася ў арэндзе генерал-паручніка Гроценгельма, выдавалася па 2 тыс. руб. штогод з даходаў Полацкай губерні «до случившейся впредь вакантной аренды» [15, № 3, с. 98]. Арганізацыя Мінскай губерні, акрамя існаваўшых з часоў Рэчы Паспалітай гарадоў Мінск, Мазыр, Пінск, прадугледжвала неабходнасць пакупкі дзяржаўнай казной ці размену казённых мястэчак Вілейка, Докшыцы, Дзісна, Барысаў, Бабруйск, уладання віленскага біскупства Ігумена, прыватнаўладальніцкіх паселішчаў Нясвіжа, Слуцка, Давыд-Гарадка, Пастаў для пераводу іх у афіцыйныя павятовыя цэнтры з размяшчэннем прысутных устаноў [16, с. 694].

Зварот у дзяржаўную казну старосцінскіх мястэчак ад пажыццёвых уладальнікаў з мэтай стварэння павятовых цэнтраў вымагаў выдачы пасэсарам сум грашовай кампенсацыі за іх саступку і прыносімыя даходы. Згодна з ведамасцю імператрыцы Кацярыны II ад 01.10.1796 г.,

належала выплачваць штогод уладальніку мястэчка Ашмяны ашмянскаму старастце Тадэвушу Коцелу 524 руб. 84,75 кап., Слоніма былому гетману вялікаму ВКЛ Міхалу Казіміру Агінскаму 5061 руб. 84,5 кап., Ліды лідскаму старасце Іосіфу (Юзафу) Сцыніену 363 руб. 78,25 кап., Навагрудка навагрудскаму ваяводзе Іосіфу (Юзафу) Несялоўскаму 48 руб. 32,75 кап., Ваўкавыска генерал-лейтэнанту Паўлу Грабоўскаму 86 руб. 95 кап., а разам дзевяці ўладальнікам гарадскіх паселішчаў прызначалася штогод да смерці адпускаць 7149 руб. 67,25 кап. Гэтую суму ўладальнікі старосцінскіх маёнткаў атрымлівалі як чысты штогадовы даход, а ў дзяржаўную казну павінны былі ўносіць такую ж суму (т. зв. 2 кварты з старосцінскіх маёнткаў). Штогадовы расход на пенсіі разам з грашовай стратай ад недаатрымання даходу склаў бы 14916 руб. 25 кап. – кампенсацыйнай сумы, неабходнай для ператтварэння мястэчак у павятовыя гарады [15, № 7, с. 40–41]. Выкуп 11 прыватных мястэчак для пераводу іх у павятовыя цэнтры патрабаваў 8786 руб. пры супольным даходзе мястэчак у 14 760 руб. і мяркуемых М. В. Рапніным 396 тыс. руб. гадавога даходу [17, с. 379]. У пачатку верасня 1796 г. гетман М. К. Агінскі пагадзіўся саступіць дзяржаўнай казне дамы ў Слоніме для размяшчэння тут прысутных устаноў і кватэры генерал-губернатара. М. К. Агінскі жадаў за дамы атрымоўваць штогадовую пенсію ў 3 тыс. руб., але М. В. Рапнін прапаноўваў яму сплачваць толькі 2,5 тыс. руб. [15, № 7, с. 42].

У 1805 г. у сувязі з прылічэннем мястэчка Лепель у казённае ведамства і пераводам яго ў павятовы горад належачыя Віленскаму бернардзінскаму жаночаму манастыру 274 манастырскіх сялян пераводзіліся ў мяшчане, а манастыру ўзамен з дзяржаўнай казны належаў штогадовы даход з былога мястэчка [18], які былы ўладальнік у памеры 2000 руб. павінен быў атрымаць з дзяржаўнай казны [19, с. 113].

Пазней урадам былі выкуплены Радашковічы (1817 г.), Гомель (1831–1834 гг.), Слуцк (1846–1847 гг.), паступілі ў дзяржаўны скарб 1/5 частка Відз (1802 г.), Ашмяны (1843 г.). У 1831 г. у ведамстве Міністэрства дзяржмаёмасцей апынуўся Стары Быхаў. Розныя асобы былі абавязаны дзяржаўнай казне за праданыя князем Я. Сапегай паселішчы Быхаўскага маёнтка 121 233,95 руб. [20, арк. 116]. У 1850-я гг. дзяржаўная казна набыла правы на заштатныя гарады Друя, Докшыцы, Нясвіж, павятовы цэнтр Сянно, апошнім уладальнікам якога быў ротмістр Шыбека.

У цэлым пасля ліквідацыі Рэчы Паспалітай самадзяржаўная ўлада Расійскай імперыі прыняла на сябе шэраг фінансавых даўгавых абавязацельстваў былой польскай рэспублікі, апошняга караля дзяржавы

Станіслава Аўгуста Панятоўскага і яго прыбліжаных, удзельнічала ва ўрэгуляванні грашовых запазычанасцей некаторых магнатаў. Выкуп дзяржавай былых у Рэчы Паспалітай прыватнаўласніцкіх мястэчак і прыватнауладальніцкіх гарадоў ажыццяўляўся з мэтай пераводу іх у афіцыйныя павятовыя цэнтры ці заштатныя гарады.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Несцярчук, Л. М.* Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Манарх, асветнік, мецэнат / Л. М. Несцярчук. – Брэст: ААТ «Брэсцкая друкарня», 2011. – 300 с., іл.

2. *Мигулин, П. П.* Русский государственный кредит (1769–1899). Опыт историко-критического обзора / П. П. Мигулин. – Харьков: Типо-литография «Печатное дело», 1899. – Т. 1: 1769–1888. – IV, 606, XII с.

3. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах / соч. Михаила Де-Пуле. – 2-е изд. – Санкт-Петербург: Тип. Майкова, 1871. – IV, 255 с.

4. Архив князя Воронцова: в 40 т. – Москва: Тип. Лебедева, 1870–1897. – Кн. 13: Бумаги графов Александра и Семена Романовичей Воронцовых. Письма князя Безбородки (1776–1799). – 1879. – XII, 507 с.

5. Конвенция от 4(15).01.1797 г. между их величествами императором всероссийским, королем прусским и императором римским об окончательном разделе Польши и акт отречения его величества короля польского Станислава Августа от королевства своего // Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т. – Санкт-Петербург: Тип. 2-го отд-ния собствен. его император. величества канцелярии, 1830 (далей – ПСЗ-1). – Т. 24. – № 17736. – С. 280–285.

6. О выдаче общей облигации на 88 300 000 гульденов голландских в пользу амстердамских банкиров Гопе и компании, на прописанных в сем указе условиях: именной указ, данный Сенату 15.01.1798 г. // ПСЗ-1. – Т. 25. – № 18326 а. – С. 33–39.

7. *Правилова, Е. А.* «Польский долг» Российской империи: к истории российской финансовой политики конца XVIII – начала XIX в. / Е. А. Правилова // Страницы российской истории: проблемы, события, люди. – Санкт-Петербург, 2003. – С. 130–139.

8. Дружественный трактат, заключенный в Вене между его величеством императором всероссийским и его величеством королем прусским о распоряжениях, относящихся к Герцогству Варшавскому 12.04.(8.05.)1815 г. // ПСЗ-1. – Т. 33. – № 25827. – С. 78–87.

9. О долгах полковника графа Льва Соллогуба: высочайше утвержденное 1.02.1827 г. положение Комитета министров, опубликованное 18.03.1827 г. // ПСЗ-2. – Т. 2. – № 867. – с. 93.

10. *Цитович, С. Г.* Горыгорецкий земледельческий институт – первая в России высшая сельскохозяйственная школа (1836–1864) / С. Г. Цитович. – Горки: Изд. Белорус. сельскохоз. акад., 1960. – 276 с.

11. О долгах полковника графа Льва Соллогуба: высочайше утвержденное 1.02.1827 г. положение Комитета министров, опубликованное 18.03.1827 г. // ПСЗ-2. – Т. 2. – № 867. – С. 86–98.

12. О закрытии временной Комиссии по делам о долгах принцев Виртембергских: высочайше утвержденное 8.12.1842 г. положение Комитета министров, распубликованное 9.01.1843 г. // ПСЗ-2. – Т. 17-2. – № 16303. – С. 191–194.

13. *Бржеский, Н. К.* Государственные долги России: историко-статистическое исследование / Н. К. Бржеский. – Санкт-Петербург: Типолитография А. М. Вольфа, 1884. – XII, 283, 67 с.

14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 112.

15. *Жукович, П.* Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II / П. Жукович // Журнал Министерства народного просвещения (ЖМНП). – 1914. – № 3. – С. 88–120; № 7. С. 2–43.

16. О разных распоряжениях касательно устройства Минской губернии: именной указ 3.05.1795 г., данный правящему должность генерал-губернатора минского, изяславского и брацлавского генерал-поручику Тутолмину // ПСЗ-1. – Т. 23. – № 17327. – С. 694–695.

17. *Анішчанка, Я. К.* Інкарпарацыя: Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай / Я. К. Анішчанка. – Мінск: Хурсік, 2003. – 470 с.

18. О причислении местечка Лепеля, состоящего в Витебской губернии, в казенное ведомство и об обращении оного в уездный город: именной указ 5.04.1805 г., данный Сенату // ПСЗ-1. – Т. 28. – № 21704. – С. 972.

19. *Без-Корнилович, М. О.* Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с привосокуплением и других сведений к ней же относящихся / М. О. Без-Корнилович. – Санкт-Петербург: Тип. 3-го отд-ния собствен. е.и.в. канцелярии, 1855. – 355 с.

20. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 7438.